■ Памяць

# ПАСЛЯ ВАЙНЫ...

**Як выглядаў Віцебск у першыя пасляваенныя гады, можна ўбачыць на рэдкіх фотаздымках Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, большасць з якіх ніколі не публікавалася.**

— Фотадакументы маюць важнае значэнне ў гістарычных даследаваннях. Яны не толькі дапаўняюць пісьмовую інфармацыю, але і выступаюць самастойнымі крыніцамі. Фота фіксуюць і перадаюць факты і ўздзейнічаюць эмацыянальна. У зборы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея 280 фотаздымкаў і 18 негатываў, якія датуюцца 1945 годам. У іх ліку маюцца хрэстаматыйныя здымкі, якія выкарыстоўваліся як ілюстрацыйны матэрыял у навуковых і навукова-папулярных працах, апублікаваны ў многіх выданнях. Але большасць фатаграфій уводзіцца ў навуковае абарачэнне ўпершыню, — расказвае **галоўны захавальнік фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Вольга ДАВІДОЎСКАЯ.**

Здымкі паступалі ў музей на працягу 1945-1946 гадоў ад розных арганізацый: камунальнай гаспадаркі горада, ваенкамата, НКУС, са збору беларускага мастацтвазнаўцы Міхала Кацара. Але большасць фотадакументаў — ад арцелі «Гігіена». Гэта вытворчае аб'яднанне працавала яшчэ да вайны як цырульня. Пасля вызвалення горада яно аднавіла дзейнасць літаральна на наступны дзень: 27 чэрвеня 1944 года. Апроч іншага, майстры выконвалі заказы на выраб фотаздымкаў па дамоўленасці з рознымі арганізацыямі і ўстановамі.

— Па адным асобніку большасці фотаздымкаў, выкананых у арцелі, перададзена Дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, па адным-два — у віцебскі музей. Першыя фота былі перададзены нам 28 студзеня 1945 года — шэсць здымкаў разбуранага чыгуначнага вакзала і разбуранага моста праз Заходнюю Дзвіну. Пазней — здымкі разбураных прадпрыемстваў, будынкаў розных устаноў і арганізацый... Другая група фатаграфій адлюстроўвае ход аднаўленчых работ у Віцебску. На пяці картках адлюстравана будаўніцтва моста праз Віцьбу (сучасны Кастрычніцкі мост). Яно пачалося яшчэ ў канцы 1944 года і скончылася ў маі 1945 года. Кіраўніцтва горада лічыла будаўніцтва мастоў адной з найважнейшых сваіх задач. На гэтую справу мабілізавалася непрацоўнае насельніцтва Віцебска, супрацоўнікі розных устаноў і арганізацый, — працягвае музейны работнік.

На думку Вольгі Давідоўскай, асобна трэба вылучыць здымкі, якія адлюстроўваюць розныя праявы палітыкі фашысцкіх акупацыйных улад у дачыненні да мясцовага насельніцтва. На такіх фота — будынкі, занятыя падчас акупацыі нямецкімі або мясцовымі органамі ўлады, у тым ліку фельдкамендатурай (сучасны будынак ветэрынарнага інстытута). Ёсць некалькі здымкаў падвалаў былой фашысцкай турмы СД. Апошняя знаходзілася на вуліцы Крылова, 7. Цяпер тут размяшчаецца Віцебскае духоўнае вучылішча, у падвалах — музейная экспазіцыя «Памяці патрыётаў Віцебшчыны». Захаваўся 21 фотаздымак надпісаў, пакінутых вязнямі на сценах турэмных камер...


Будынак, дзе цяпер знаходзіцца рэстаран (калісьці — жылы дом).


Суботнік па аднаўленні Віцебска. Фота зроблена ў снежні 1945 года.

— Частка здымкаў зроблена на тэрыторыі аднаго з самых буйных у Беларусі канцлагераў «5-ты полк». Ён знаходзіўся на ўскрайку Віцебска. Лагер быў створаны ў хуткім часе пасля акупацыі горада. Існаваў да мая 1944 года. Ва ўмовах недахопу ежы, цяжкай прымусовай працы, антысанітарыі, здзекаў і катаванняў у лагеры ўтрымліваліся ваеннапалонныя і цывільныя. Многія былі расстраляны. Памерлых хавалі тут жа. У лагеры было 150 тысяч чалавек, з якіх 80 тысяч загінулі, — канстатуе суразмоўца.

Па заказе аддзела камунальнай гаспадаркі гарвыканкама здымкі рабіў маскоўскі фатограф і архітэктар. У музеі захоўваецца ўсе 100 здымкаў, выкананых А. Жарковым. Яны былі перададзены ў фонды ў 1946 годзе, кожны здымак у адным экземпляры. Гэтыя фота адлюстроўваюць пераважна стан прадпрыемстваў, будынкаў, розных устаноў. Фатограф зафіксаваў і першыя заняткі ў вышэйшых навучальных установах. У прыватнасці, лекцыю ў ветэрынарным інстытуце, падрыхтоўку да заняткаў у інтэрнаце педагагічнага інстытута...

Даследчыца лічыць, што адзін са здымкаў можна назваць унікальным. На ім выява могілак побач з царквой у гонар Уздзвіжання Крыжа (знаходзіліся ў пачатку цяперашняга Маскоўскага праспекта). На фота выразна відаць пашкоджаны будынак царквы і даваенныя надмагіллі. На першым плане — некалькі абеліскаў на магілах загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі. На жаль, царква і могілкі не захаваліся да нашага часу. Здымак доўга заставаўся адзінай выявай гэтага храма.

Дарэчы, гарадская ўлада ў 1945 годзе клапацілася аб ахове помнікаў архітэктуры. Прынамсі, гэтаму ўдзялялася ўвага на адным з пасяджэнняў гарсавета. Канстатавалася, што ў Дабравешчанскай царкве (старэйшы храм XII стагоддзя. — **Аўт.**) няма даху, там без дазволу жывуць гараджане. А ў дамініканскім касцёле зрабілі склад, і яго дах таксама трэба аднаўляць. Гаварылі і пра жудасны стан іншых збудаванняў. Вырашылі звярнуцца да абласнога Савета з просьбай аб прыняцці мер па аднаўленні і захаванні помнікаў архітэктуры.

— Але, на жаль, мякка кажучы, далёка не ўсё было зроблена для захавання культавых пабудоў. І тое, што не было знішчана ў гады вайны, разбурылі ў мірны час. У Віцебску аўтэнтычнымі можна назваць толькі некалькі храмаў, — рэзюмавала Вольга Давідоўская.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**
*pukshanski@zviazda.by*
*Фота з архіва Віцебскага абласнога краязнаўчага музея*

■ Традыцыі

# ПАКЛАНЯЮЧЫСЯ ЗЯМЛІ, ЦІ ОДА ЖЫЦЦЮ

## Сімбіёз архаікі і сучаснасці — у новым фотапраекце

**Каляровая і пярэстая штодзённасць — бачылі такое? Марына Бацюкова дакладна. Яе фотапраект «Сула. Непарыўнае» адкрыўся ва ўнутраным дворыку Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Ад аб'ектыва ўважлівага рэпарцёра не выслізнула ніводная дэталь, што пацвярджае абаяльнасць простых, знаёмых рэчаў з жыцця беларускай вёскі.**

Фатограф даследуе нашы карані, традыцыі, тое спрадвечнае, што закладвае разуменне свету і пакідае адбітак у свядомасці будучых пакаленняў. Фальклор — тая частка культуры, якая не паддаецца модным плыням, самабытная і ўнікальная.

Аўтарка цікавіцца этнаграфіяй, у гэтым выпадку старадаўнімі абрадамі. Сула, або ваджэнне і пахаванне стралы — адзін з іх. На фотаздымках, як і ў любога рэпарцёра, які не змяняе рэальнасць у «Фоташопе», і без спецэфектаў прасочваецца сімвалічная сувязь сучаснасці і мінулага. Бабулі ў старадаўніх квяцістых спадніцах і стаптаных сандалях, вышываных кашулі і каралі з хусткамі суседнічаюць з новымі аўтамабілямі на вясковых вулачках, роварамі і мабільнымі тэлефонамі. Сама форма выстаўкі — таксама сімбіёз. Фотаздымкі на вялікіх палотнах упісаны не ў рамы музея, а ў цагляныя сцены, вароты гаражоў, лавачкі і краты ў дворыку. І ў гэтым іх чароўнасць.

Марына Бацюкова даследуе жыццё ў вёсках Неглюбка і Стаўбун Гомельскай вобласці падчас вясновага свята, якое суправаджаецца тым самым абрадам «Ваджэнне і пахаванне стралы (сулы)». Прыцягальнасць свята ў тым, што традыцыі яго правядзення не змяняюцца. Жыхаркі вёсак па-ранейшаму надзяваюць традыцыйнае адзенне, збіраюцца разам, водзяць карагоды і ідуць шэсцем да жытнёвага поля. А тую самую сулу, дарэчы, закопваюць у зямлю, таму што яна — сімвал цёмных разбуральных сіл, якія павінны ператварыцца ў дабро, багацце і поспех, утаймаваць прыродныя стыхіі. Так прыходзіць лета, з'яўляецца ўраджай. А калі паляжыш у жыцце, то знойдзеш сілу і здароўе. Мяркуючы па фота, яны і праўда шчаслівыя.

Дарэчы, абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» з'яўляецца нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі.

Выстаўка працуе да 11 верасня.

**Марыя ВОЙЦІК.**
**Фота аўтара**

